3. Солошенко, В.И. Большевики в борьбе с мелкобуржуазными партиями в Белоруссии (1903 – март 1917 г.) – Минск: Беларусь, 1981. – 206 с.
4. Бригадин, П.И. Эсеры в Беларуси (конец XIX в. – февр. 1917 г.) – Минск: Згода, 1994. – 152 с.
5. Национальный архив Республики Беларусь (далее – НАРБ) – Ф. 325. – Оп. 1. – Д. 193.
6. Турук, Ф. Белорусское движение: очерк истории национального и революционного движения белорусов / Ф. Турук. – Москва: Типография «Под / отдела Инвалидов», 1921. – 143 с.
7. Борьба. – 1918. – №№ 1–5. – С. 7.
8. Сташкевич, Н.С. Отвергнутые революцией / Н.С. Сташкевич. – Неман. – 1980. – № 3. – С. 193.
9. Государственный архив Минской области. – Ф. 24. – Оп. 1. – Д. 3668.
10. Национальный исторический архив Беларуси. – Ф. 1. – Оп. 3. – Д. 270.
11. НАРБ. – Ф. 60. – Оп. 3. – Д. 73.


*Материал поступил в редакцию 30.09.16*

***SHCHAVLINSKY N.B. Ethnic question in activity of the Jewish organizations in Belarus in the years of World War I (1914-1918)***

Being based on a wide range of Sources including archival material the paper discusses socio-political and national-cultural activities of Jewish organization in Belarus during World War I (1914–1918). The Bund, the Poale Zion, the Jewish Socialist Workers Party (the Sickle) were the most active of them.

УДК 327(438):94|1918/1939|

***Грыбава С.У.***

# ПОЛЬСКАЯ ПАЛІТЫКА «ПРАМЕТЭІЗМУ» (НА ПРЫКЛАДЗЕ ТАТАРСКА-МУСУЛЬМАНСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА II РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ)

У дадзеным артыкуле раскрываецца сутнасць палітыкі «праметэізму», якую праводзілі ўлады ІІ Рэчы Паспалітай, у тым ліку і ў дачыненні да татарска-мусульманскага насельніцтва дзяржавы.

Асабліва актыўна «Праметэізм» ажыццяўляўся з 1926 г. Палітыка мела на мэце нейтралізаваць СССР як моцнага суседа шляхам расчлянення яго на асобныя дзяржаўныя ўтварэнні з нярускіх народаў, у тым ліку, безумоўна, і татарска-мусульманскіх пад пратэктаратам Польшчы. Палітыка «Праметэізму» адбівалася і на польскіх татарах [1, с. 453–457; 2, s. 15].

Пастаўленую задачу Польская дзяржава здзяйсняла, супрацоўнічаючы з прадстаўнікамі палітычнай эміграцыі з Савецкай Расіі на Захадзе. Так, у 1926 г. у Парыжы была створана арганізацыя «Праметэўш», а ў 1926 г. у Варшаве – яе філіял клуб «Праметэўш», куды ўваходзілі прадстаўнікі ўкраінскай, грузінскай, азербайджанскай, туркменскай, паўночнакаўказскай эміграцыі, а таксама татары Крыма і Ідэль-Урала. Клуб меў антысавецкі характар і ставіў сваёй мэтай абарону правоў народаў Каўказа і Украіны, а пазней памкненняў да незалежнасці і астатніх нярускіх народаў СССР [3, s. 50–51]. У межах руху «праметэізму» ў 1928 г. у Варшаве быў створаны «Камітэт для незалежнасці Ідэль-Урала», які выдаваў у Берліне арабіцай (у знак пратэсту супраць савецкай моўнай палітыкі, так як у Татарстане ў сярэдзіне 1920-х гг. арабскі шрыфт быў адменены) у 1928–1939 гг. часопіс «Новы нацыянальны шлях» [4, с. 83].

У ІІ Рэчы Паспалітай у напрамку рэалізацыі палітыкі «праметэізму» дзейнічалі дзяржаўныя інстытуты, сярод іх Экспазітура № 2 ІІ Аддзела Генеральнага штаба польскага войска, якая падзялялася на шэраг аддзелаў, у тым ліку Аддзел Б ці самастойны сектар «Усход» [3, s. 44]. У яго кампетэнцыі была і тайная апека над дзейнасцю Культурна-асветніцкага саюза татараў ІІ Рэчы Паспалітай (КАСТРП), некаторыя ініцыятывы і дзеячы якога тайна ім фінансаваліся. Створаны ў Варшаве Інстытут Усходні як навуковы і палітычны орган «праметэізму» прадстаўляў свае памяшканні для здзяйснення рэлігійных культаў мусульманскай гміне ў Варшаве, дзе на набажэнствах маглі прысутнічаць акрамя польскіх крымскія, казанскія мусульмане і іншыя прадстаўнікі ісламскага свету. Наладжванню кантактаў польскіх татараў з «праметэйскай» эміграцыяй у ІІ Рэчы Паспалітай спрыялі і арганізаваныя інстытутам лекцыі, таварыскія спатканні, вечарыны. Такога кшталту тэндэнцыі мелі месца і ў Вільні, дзе навуковым цэнтрам «праметэізму» быў Інстытут даследаванняў Еўропы Усходняй. Некаторыя даследчыкі лічаць, што дадзеныя акалічнасці спрыялі развіццю ў асяроддзі польскай татарскай эліты ідэалогіі панісламізму, панцюркізму і татарскага нацыяналізму (пад кантролем польскай дзяржавы) [1, s. 461].

З 1936 г., асабліва ў 1937–1939 гг., галоўным цэнтрам прапаганды дадзенай ідэалогіі было Кола татарскай моладзі (КТМ) у Вільні. (З 1937 г. – Цэнтральная рада гурткоў татарскай моладзі Рэчы Паспалітай, у склад якой уваходзіла сем чалавек.) Гэтую арганізацыю ўзначальваў Эдыгей Шынкевіч. Функцыі яго намесніка выконваў Алі Смайкевіч. У адозвах КТМ, аўтарамі якіх былі яго вызначаныя лідэры, ідзе размова аб Крыме і Ідэль-Урале як аб «краях блізкіх нашаму сэрцу» [1, s. 453]. Аб дзейнасці Эдыгея Шынкевіча падрабязней размова пойдзе ніжэй.

Згаданая ідэалогія прапагандавалася на старонках часопісаў «Жыццё татарскае» і «Ісламскі агляд», якія выдаваліся КАСТРП і фінансаваліся дзяржаўнымі органамі [1, s. 461; 3, s. 140–141]. Польская дзяржава мела на мэце падрыхтоўку кадраў з вызначанай ідэалагічнай накіраванасцю дзеля адпраўкі іх на ўсход, дзе яны павінны былі б спрыяць стварэнню «незалежных» дзяржаўных утварэнняў і праводзіць польскія палітычныя інтарэсы.

Можна адзначыць, што да муфціяту, які дзейнічаў у Вільні з 1925 г., мелі дачыненне татарскія эмігранцкія колы ў Крыме. Брат муфція Якуба Шынкевіча Мустафа Шынкевіч удзельнічаў у грамадска-палітычным руху ў Крыме ў 1917–1920 гг. У 1917 г. у Сімферопале быў створаны Саюз татараў літоўскіх, які ён узначаліў. У 30-я гг. ХХ ст. Мустафа быў арыштаваны НКУС і разам з сям'ёй высланы на поўнач, дзе і памёр. Яго сын Эдыгей Шынкевіч збег праз Каўказ у Іран, дзе звярнуўся да польскага пасольства. Па дарозе ў Польшчу ў 1935 г. ён устанавіў блізкія кантакты з лідэрам палітычнай эміграцыі крымскіх татараў у Турцыі Джафарам Сэйдаметавым.

Пасля прыбыцця ў Польшчу жыў у Вільні, дзе пачаў вучыцца ў Школе палітычных навук пры Інстытуце даследаванняў Еўропы Усходняй, якому, дарэчы, выдзяляліся фінансавыя сродкі Усходнім аддзелам Міністэрства замежных спраў ІІ Рэчы Паспалітай і Экспазітурай № 2 ІІ Аддзела генеральнага штаба Польскай Арміі дзеля развіцця ідэй «праметэізму» [2, s. 81]. Як ужо згадвалася, Э. Шынкевіч у Вільні арганізаваў Кола татарскай моладзі, а пазней Цэнтральную раду гурткоў татарскай моладзі. Сваю дзейнасць ён накіроўваў на заснаванне блізкіх кантактаў з крымскімі татарамі і з крымскай палітычнай эміграцыяй у Турцыі. Дарэчы, у мэтах палітыкі «праметэізму», якую здзяйсняла ІІ Рэч Паспалітая, дзяржаўным бюджэтам на 1939–1940 гг. было прадугледжана штомесячнае фінансаванне татарскіх нацыянальных колаў у Крыме, Ідэль-Урале і Туркестане, якія знаходзіліся ў

***Грибова Светлана Владимировна**, доцент кафедры гуманитарных наук Брестского государственного технического университета. Беларусь, БрГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*

эміграцыі (Турцыі, Францыі і Польшчы). Агульная сума фінансавання на адзначаны год, якая датычылася палітычнага кірунку дзейнасці, складала 9600 злотых у месяц [2, s. 85].

У 1938 г. у Э. Шынкевіча існаваў праект стварэння з эмігранцкай татарскай моладзі ў Польшчы і моладзі з ліку польскіх татараў арганізацыі «блакітных кашуль» (нацыянальны татарскі колер) накшталт «карычневых кашуль», якая б прытрымлівалася нацыяналсацыялістычнай ідэалогіі. Аднак дадзены праект не быў рэалізаваны [1, s. 462]. У 1939 г. Э. Шынкевіч эвакуіраваўся разам з супрацоўнікамі турэцкага пасольства ў Турцыю.

У 1942 г. пляменнік муфція Я. Шынкевіча Эдыгей (псеўданім Кірымаль) прыбыў у Вільню як прадстаўнік Чырвонага Паўмесяца па справах савецкіх ваеннапалонных з ліку крымскіх татараў пры германскім штабе сухапутных войскаў. Ён меў заданне прапагандаваць сярод мясцовых татараў арганізацыю і дзейнасць татарскіх камітэтаў і самакіравання ў Крыме пад пратэктаратам Германіі. Аднак падтрымкі сярод мясцовых татараў ён не знайшоў. На супрацоўніцтва былі згодны толькі крымскія татары, якія знаходзіліся ў лагерах ваеннапалонных [5, s. 147; 6, s. 96–97]. Трэба адзначыць, што Эдыгей-Кірымаль быў актыўным дзеячам падчас германскай акупацыі ў Крыме ў гады Другой Сусветнай вайны. А ў лістападзе 1943 г., калі ў Германіі (у Франкфурт-на-Одэрэ) пачаў фарміравацца з-за складанай для гітлераўцаў сітуацыі на фронце «Крымскі цэнтр», стаў адным з яго кіраўнікоў. Трэба заўважыць, што Кірымаль быў у вельмі цесных адносінах з Вялікім муфціем Іерусалімскім Аль-Хусейні [7, с. 64]. Пасля вайны Кірымаль-Эдыгей Шынкевіч жыў у Германіі ў г. Мюнхене, дзе займаўся навукай. Памёр у 1980 г.

Вялікі муфцій Іерусалімскі Хаджы Мухамед Амін аль-Хусейні быў прызначаны нямецка-фашысцкімі захопнікамі «правадыром» усіх мусульман Вялікай Германіі [6, s. 94].

Аль-Хусейні быў абраны на пасаду Вялікага муфція Іерусалімскага ў 1921 г. Яго бацька таксама насіў гэты тытул. Сітуацыя на Блізкім Усходзе ў 30-я гг. XX ст. была вельмі складанай. З пункту гледжання сучаснага нямецкага даследчыка Г. Концэльмана, менавіта муфцій быў тым чалавекам, які «знайшоў словы, неабходныя для таго, каб мабілізаваць мусульманскую самасвядомасць (і не толькі ў Палесціне). Яму і яго адзінадумцам удалося стварыць значныя перашкоды для брытанскага кіраўніцтва пратэктаратам» [8, с. 38]. Муфцій імкнуўся быць адзіным рэлігійным і палітычным лідэрам у арабскім рэгіёне і дзеля гэтага стварыў Вышэйшы арабскі камітэт (ВАК) як аснову для арабскай дзяржавы пасля вызвалення Палесціны ад англічан. ВАК патрабаваў ад Англіі забароны далейшага прыбыцця яўрэяў у Палесціну. Англічане адмовілі і арыштавалі ўсіх лідэраў камітэта. Аднак муфцію ўдалося збегчы. Восенню 1939 г. ён апынуўся ў Багдадзе. Гады выгнання ён выкарыстаў для ўмацавання сувязей з Германіяй для здзяйснення сваіх мэт. 28 лістапада 1941 г. адбылася сустрэча муфція Аль-Хусейні спачатку з У.Ф. Рыбентропам, а потым яго прыняў і сам А. Гітлер. У размове з міністрам замежных спраў муфцій адразу заявіў, што «арабы – гэта сапраўдныя сябры Германіі, так як яны маюць трох агульных ворагаў: англічан, яўрэяў і бальшавікоў». Ён прапанаваў стварыць Арабскі легіён на баку Германіі, зрабіў яшчэ шэраг прапаноў, у выніку рэалізацыі якіх, на яго думку, ён бы стаў безумоўным лідэрам мусульманскага свету. Аднак У.Ф. Рыбентроп ніякіх далёка ідучых абяцанняў не даў. Муфцій быў расчараваны і пасля размовы з А. Гітлерам, калі ізноў пачуў туманныя разважанні на гэты конт. У канцы 1941 г. муфцій усё ж атрымаў згоду ад Міністэрства замежных спраў, а потым і ад самаго А. Гітлера на стварэнне разам з вышэйшым камандаваннем вермахта Арабскага легіёна для вядзення баявых дзеянняў на Блізкім Усходзе, але толькі пасля перамогі Германіі на Каўказе. Муфцій абавязаўся пастаўляць людскія рэсурсы ў легіён, чым некаторы час і займаўся [9, с. 307].

Застаўшыся ў Германіі, Аль-Хусейні прымаў актыўны ўдзел у рэлігійным і палітычным жыцці. Ён выступаў з пропаведзямі ў германскіх мячэцях, на розных сходах, публікаваў свае выступленні ў выглядзе брашур, дзе крытыкаваў яўрэяў, бальшавікоў і англічан-імперыялістаў [9, с. 305–306]. Муфцій выконваў функцыі свайго роду «рэлігійнага коміваяжора» на службе ў германскага ўрада, наведваючы на працягу 1942–1945 гг. усе месцы фарміравання мусульманскіх легіёнаў, дзе выступаў з заклікам да свяшчэннай вайны супраць няверных у саюзе з Германіяй [8, с. 149].

Трэба адзначыць, што Вялікаму муфцію Іерусалімскаму падпарадкоўваўся зацверджаны на пасаду муфція «Остланда» Якуб Шынкевіч. [6, s. 94]. Ён разам са сваімі паплечнікамі заняў дастаткова актыўную пазіцыю падтрымкі акупацыйных германскіх улад.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што польская палітыка «праметэізму», якая здзяйснялася ўладамі ІІ Рэчы Паспалітай у міжваенны перыяд, спрыяла развіццю ў асяроддзі польскай татарскай эліты ідэалогіі панісламізму, панцюркізму і татарскага нацыяналізму, што ў сваю чаргу прывяло да таго, што частка татарскай эліты заходніх рэгіёнаў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны імкнулася рэалізаваць свае нацыяналістычныя ідэі, супрацоўнічаючы з германскімі акупацыйнымі ўладамі.

### СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Chazbijewicz, S. Ewolucja ideologii polskich muzulmanow w latach 1934–1939 / S. Chazbijewicz // Татары-мусульмане на землях Беларусі, Літвы і Польшчы: матэрыялы Першай міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. да 600-годдзя татарскага асадніцтва на землях Беларуска-Літоўскай дзяржавы, распачатага пры Вітаўце Вялікім, Мінск, 26–27 сак. 1993 г.: у 3 ч. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: І. Александровіч [і інш.]. – Мінск, 1995. – Ч. 3. – С. 449–467.
2. Zbior dokumentow pplk. Edmunda Charaszkiewicza / Komitet Badan Naukowych; opracowanie A. Grywacz, M. Kwiecien, G. Mazur. – Krakow: Centrum dokumentacji czynu niepodleglosciowego, ksiegarnia Akademicka, 2000. – 185 s.
3. Maj, I.P. Dzialalnosc Instytutu Wschodniego w Warszawie 1926–1939 / I.P. Maj. – Warszawa: Instytut studiow politycznych PAN, 2007. – 291 s.
4. Цвиклински, С. Татары и башкиры в Германии на фоне катаклизмов XX в. / С. Цвиклински // Диаспоры. Независимый научный журнал. – 2005. – № 2. – С. 81–95.
5. Tyszkiewicz, J. Z historii tatarow polskich 1794–1944 / J. Tyszkiewicz. – Pultusk, 1998. – 176 s.
6. Chazbijewicz, S. Tatary polsko-litewscy w latach II wojny swiatowej / S. Chazbijewicz // Meandry cywilizacyjne, kwestie narodowosciowe i polonijne. – T. II. – 1997.– S. 91–98.
7. Романько, О.В. Мусульманские легионы Третьего Рейха. Мусульманские добровольные формирования в германских вооруженных силах (1939–1945 гг.) / О.В. Романько. – Симферополь: Таврич. нац. ун-т им. В.И. Вернадского, предприятие «Таврия плюс», 2000. – 90 с.
8. Романько, О.В. Мусульманские легионы во Второй мировой войне / О.В. Романько. – М.: АСТ: Транзиткнига, 2004. – 321 с.
9. Гилязов, И.А. Коллаборационистское движение среди тюркско-мусульманских военнопленных и эмигрантов в годы Второй мировой войны: дис. … д-ра ист. наук: 07.00.02 / И.А. Гилязов. – Казань, 2000. – 400 л.


*Материал поступил в редакцию 10.11.16*

***GRIBOVA S.V. The Polish policy of «Prometheism» (in terms of the Tatar-Muslim population of the Second Polish Republic)***

In this article the policy essence to Prometheism which was carried out by the Polish authorities to an inter war period reveals, its influence on forming in the environment of the Polish Tatar elite of ideology to Pan-Islamism, a pantsyurkizm and the Tatar nationalism is noted that in turn, led to the fact that a part of the Tatar elite of the western regions of Belarus in days of the Great Patriotic War aimed to realize the nationalist ideas, cooperating with the German occupational authorities. The attention to Edygey Shinkevich's activities is paid (the nephew Yaqub Shinkevich who was approved to a position of the mufti of Ostland) in the direction of distribution of the ideas of this sort, and also to activities of the Great mufti Jerusalem Al-Hussein who aimed at a cooperation with the German authorities and it was appointed German - fashystsky aggressors "leader" of all Muslims of Great Germany.